# Навучанне грамаце ў дапаможнай школе

В.Ч. Хвайніцкая

# Асноўны метад навучання грамаце (НГ)

- гукавы аналітыка-сінтэтычны метад

## Гукавы аналітыка-сінтэтычны метад

найбольш поўна адлюстроўвае фанетычны і фанематычны характар беларускага пісьма.

# Асноўныя палажэнні методыкі:

1. Адзінкай навучання з'яуляецца гук, які абазначаецца пэўнай літарай.
2. На працягу ўсяго перыяду НГ спалучаюцца прыёмы аналізу і сінтэзу (тэкст падзяляецца на сказы, сказы дзеляцца на словы, словы на склады, вылучаюцца гукі і наадварот: з гукаў складаюцца склады, далей словы, сказы, тэкст).
3. Паслядоўнасць вывучэння гукаў і літар вызначаецца пэўнымі прынцыпамі (частотнасці, артыкуляцыйнай і графаматорнай складанасці, традыцыйным).
4. Адзінкай чытання і пісьма з'яўляецца склад (адлюстраванне складовага прынцыпу беларускай графікі).

# Асноўныя палажэнні методыкі: (працяг)

5. Паслядоўнасць увядзення складовых структур вызначаецца іх прыдатнасцю для чытання, а таксама частотнасцю выкарыстання ў маўленні.
6. Навучанне чытанню і пісьму ажыццяўляецца паралельна. На ўроках чытання вучні знаёмяцца з друкаванымі літарамі, а на ўроках пісьма з адпаведнымі рукапіснымі літарамі.
7. Выхаваўчы і развіццёвы характар навучання забяспечваецца падборам пэўных практыкаванняў, тэкстаў, іх аналізам, назіраннем за моўнымі адзінкамі і інш.

# Асаблівасці навучання грамаце вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю:

## 1. Іншая паслядоўнасць вывучэння гукаў і літар.

**Парадак вывучэння вызначаецца наступнымі фактарамі:**

**а) узроўнем сфарміраванасці вымаўленчых навыкаў;**

**б) ступенню цяжкасці суаднясення гукаў і літар (спачатку галосныя);**

**в) складанасцю зліцця гукаў у склады;**

**г) частотнасцю выкарыстання гукаў у маўленні.**

# Асаблівасці навучання грамаце вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю:

2. Іншы парадак вывучэння складовых структур:

галосны, галосны-зычны, зычны-галосны, зычны-галосны-зычны, зычны-зычны-галосны-зычны, зычны-галосны-зычны-зычны.

## Асаблівасці навучання грамаце вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю:

3. **Павелічэнне тэрміну дабукварнага (далітарнага) перыяду (прапедэўтычны перыяд).**

**Мэта** дабукварнага перыяду ў дапаможнай школе – садзейнічанне фарміраванню псіхалагічнай устаноўкі на навучанне грамаце, падрыхтоўка да гукалітарнага аналізу і г. д.

# Асаблівасці навучання грамаце вучняў з інтэлектуальнай недастатковасцю:

4. Павелічэнне тэрміну навучання грамаце да 2-х гадоў.
5. Выкарыстанне складовага чытання да канца 2-га класа.
6. Карэкцыйная накіраванасць усяго працэсу навучання грамаце.
7. Выкарыстанне разнастайных наглядных апор, гульнявых прыёмаў.

## Асноўныя задачы навучання грамаце:

- развіццё моўнай здольнасці дзіцяці, г. зн. умення карыстацца роднай мовай (разумець пачутае і самастойна выказваць свае думкі);
- фарміраванне ў вучняў уяўленняў пра асноўныя моўныя паняцці, а таксама практычных уменняў элементарнага аналізу моўных з'яў;
- развіццё фанематычнага слыху;
- навучанне чытанню складоў, слоў, сказаў і элементарных тэкстаў;
- фарміраванне асноў пісьмовага маўлення;
- развіццё звязнага вуснага маўлення (выбіраць найбольш дакладныя словы для выражэння думкі, утвараць аднаструктурныя, роднасныя, складаныя словы, будаваць сказы розных тыпаў, свядома карыстацца інтанацыйнымі сродкамі выразнасці);
- фарміраванне цікавасці да чытання як сродку пазнання, пашырэнне чытацкага кругагляду.

# Этапы навучання грамаце

1 этап **Дабукварны (далітарны)**

1 клас, 1 чвэрць

2 этап **Букварны (літарны)**

1 клас, 2 чвэрць –

2 клас, 4 чвэрць

3 этап **Паслябукварны (паслялітарны)**

2 клас, 4 чвэрць

# Літаратура:


1. Вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «БЕЛАРУСКАЯ МОВА» для I–V класаў першага аддзялення дапаможнай школы (дапаможнай школы-інтэрната) з беларускай мовай навучання. – Мінск, 2016.
2. Бобла, І.М. Дабукварны перыяд навучання грамаце ў беларускамоўнай дапаможнай школе / І.М. Бобла, В.М. Краўчанка, Ф.І. Шалабасава // Дэфекталогія. – 1996. – № 5.
3. Бобла, І.М. Навучанне чытанню ў букварны перыяд у беларускамоўнай дапаможнай школе / І.М. Бобла, В.М. Краўчанка, Ф.І. Шалабасава // Дэфекталогія. – 1997. – №6.